18. Аб назначэнні тав. Варончанка А. А. Народным Камісарам Асветы БССР: пастанова Прэзідыума ЦВК БССР // Звязда. 1937. 14 мая. С. 1.
19. Менская гарадская партыйная канферэнцыя // Звязда. 1937. 5 чэрвеня. С. 2.
20. XVI з’езд КП(б)Б. Спрэчкі па справаздачнаму дакладу сакратара ЦК КП(б)Б тав. В. Ф. Шаранговіча // Звязда. 1937. 14 чэрвеня. С. 2.
21. XVI з’езд КП(б)Б. Спрэчкі па справаздачнаму дакладу сакратара ЦК КП(б)Б тав. В.Ф. Шаранговіча. Выступление т. Ворончено // Звязда. 1937. 20 чэрвеня. С. 3.
22. Рэзалюцыя XVI з’езда КП(б)Б па справаздачы ЦК КП(б)Б // Бальшавік Беларусі. 1937. № 6. С. 74-81.
23. НАРБ. Ф. 4п. Оп. 1. Д. 11005.
24. Илькевич Н. Н., Платонов Р. П. Александр Ульянов и версия НКВД об антисоветском подполье в БССР (Фальсификация органами НКВД уголовных дел в 1937-1938 гг.). Мн. : БелНИИДАД, 1997. 100 с.
25. НАРБ. Ф. 4п. Оп. 1. Д. 13277.
26. Чаўскі М., Кавалёў П. Яшчэ раз аб справах Наркамасветы // Звязда. 1937. 2 жніўня. С. 3.
27. НАРБ. Ф. 4п. Оп. 1. Д. 11014.
28. Жертвы политического террора в СССР. [Электронный ресурс]. Режим доступа: http://lists.memo.ru/index3.htm. Дата доступа: 06.07.2018.
29. Маракоў Л. У. Ахвяры і карнікі. Мінск, 2007. 440 с.

УДК 94(476) ″1941-1944″

## БЕЛАРУСЬ 1941: ПЕРШЫЯ КРОКІ ВАЙНЫ

**У.К. Коршук**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр.Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь; gpirozhnik@gmail.com*

У артыкуле разгледжана становішча на тэрыторыі Беларусі напярэдадні вайны, будаўніцтва умацаваных раёнаў, мабілізацыя ў армію ў сувязі з нападзеннем немцаў на Польшчу, пралікі савецкага кіраўніцтва ў адносінах агрэсіўнай палітыкі Германіі, якая раптоўна напала на СССР. Паказаны баі на тэрыторыі Беларусі, Чырвонай арміі і супраціўленне насельніцтва.

***Ключавыя словы:*** стан; абарона; мабілізацыя; агрэсія; пралікі; баі; супрціўленне; дапамога; узаімадзеянне; насельніцтва; партызаны; боегатоўнасць; дыверсанты; разведка; аэрадромы.

## БЕЛАРУСЬ 1941: ПЕРВЫЕ ШАГИ ВОЙНЫ

**У.К.Коршук**

*Белорусский государственный университет, пр. Независмости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь; gpirozhnik@gmail.com*

В статье рассмотрена обстановка на территории Беларуси накануне войны, строительство укрепрайонов, мобилизация в армию в связи с нападением немцев на Польшу, просчеты советского руководства в оценке агрессивной политики Германии, внезапно напавшие на СССР. Показаны бои на территории Беларуси, Красной армии и сопротивление гражданского населения.

***Ключевые слова:*** обстановка; оборона; мобилизация; агрессия; просчеты; сражения; сопротивление; помощь; взаимодействие; население; партизаны; боеготовность; диверсанты; разведка; аэродромы.

## BELARUS 1941: THE FIRST DAYS OF THE WAR

**V.K. Korshuk**

*Belarusian State University, Niezavisimosti Ave., 4, 220030, Minsk, Belarus; gpirozhnik@gmail.com*

The author provides an overview of the pre-WW2 situation on the territory of Belarus, the construction of defense units, the mobilization of the population. He makes an analysis of the misjudgment of the Soviet powers concerning the policy of Germany with respect to the USSR. As

the result the German aggression became a surprise. The Red Army defense during the first days of the occupation as well as the civil resistance are given some attention as well.

***Key words:*** situation; defense; mobilization; aggression; misjudgment; battle; resistance; interaction; guerilla movement; spies; combat readiness; intelligence; airfields.

Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны вялася работа па ўзмацненні абароназдольнасці краіны. У сувязі з пагранічным становішчам Беларусь разглядалася ў той час як вельмі важная тэрыторыя для магчымых ваенных дзеянняў. Таму значная ўвага ўдзялялася рэканструкцыі шашэйных і грунтовых дарог, пераабсталяванню чыгункі, будаўніцтву ўмацаваных раёнаў.

На тэрыторыі Беларусі у 1927-1938гг. былі створаны Полацкі, Мінскі, Мазырскі ўмацавныя раёны (УР). У 1938-1939 г. ішло ўзвядзенне Слуцкага УР. Яны прыкрывалі важныя стратэгічныя напрамкі. Але ў сувязі са зменамі ў 1939 г. заходняй граніцы СССР яны аказаліся ў глыбокім тыле. У такіх умовах кіраўніцтвам СССР было прынята рашэнне аб стварэнні на тэрыторыі Беларусі ў 1940-1941 гг. новых чатырох УР, Гродзенскага, Асавецкага, Замброўскага і Брэсцкага, агульнай даўжынёй амаль 450 км. Яны павінны былі перакрыць заходняю мяжу Беларусі, каб затрымаць на граніцы наступленне праціўніка і даць магчымасць Чырвонай арміі правесці мабілізацыю і ўступіць у бой. [5,с.213].

Кіраўніцтва Беларусі мабілізавала значныя людскія і матэрыяльныя рэсурсы на абароннае будаўніцтва. Па вольным найме, а часта па прымусовай павіннасці, людзей накіроўвалі сюды на работу. Адначасова выкарыстоўвалася праца камсамольскіх атрадаў, будаўнічых батальёнаў, салдат вайсковых часцей. У выніку тут працавала штодзенна 25-30 тыс. чалавек [7, с.341.377].

Аднак дзейнасць людзей не заўседы была скардынавана, часта іх не забяспечвалі работай, выкарыстоўвалі не па прызначэнню. Не было адпаведнага ўзаемадзеяння грамадскага і вайсковага кіраўніцтва, часта зрываліся пастаўкі абсталявання і зброі ў гэтыя раёны, пра што паведамляў 30 мая 1941 г. ў ЦК ВКП (б) П.К.Панамарэнка. Ён таксама ўздымаў пытанне пра будаўніцтва аэрадромаў у Беларусі [1, с.180]. Мелі месца і сабатаж, здрадніцтва. Усё гэта стрымлівала абароннае будаўніцтва.

Да таго ж і вышэйшае кіраўніцтва СССР не спяшалася з прывядзеннем у боегатоўнасць прыгранічных акруг. Меркавалася, што нямецкая армія яшчэ не падрыхтавана да ваенных дзеянняў супраць СССР. У немцаў не было цёплага абмундзіравання, патрэбных гаруча – змазачных матэрыялаў і інш.

У такой абстаноўцы прывядзенне ў 1941 г. у боегатоўнасць адпаведных умацаванняў на тэрыторыі Беларусі лічылася заўчасным. Кіраўніцтва краіны меркавала, што гэта можа справакаваць ускладненне адносін з Германіяй. У выніку да лета 1941 г. не былі пабудаваны новыя ўмацаваныя раёны.

А нямецкія войскі ў пачатку 1941 г. ўсё бліжэй размяшчаліся ля Беларусі, займалі зыходныя пазіцыі на незначнай адлегласці да беларускай граніцы. На тэрыторыю Беларусі засылаліся дыверсійныя групы, актыўна вялася разведвальная работа, нямецкія самалёты ўсё больш і больш парушалі паветраную прастору.

Адпаведныя службы сачылі за тым, што адбывалася, але І. Сталін лічыў, што звесткі аб падрыхтоўцы Германіі да нападзення на СССР з’яўляюцца безпадстаўнымі. У непасрэднай блізасці да граніцы ў той час знаходзілася незначная частка савецкіх вайсковых падраздзяленняў, якія былі павінны ўсюды аднолькавымі сіламі ўтрымліваць ворага. Да таго ж падрыхтоўка войскаў не адпавядала належнаму ўзроўню. Сістэма забеспячэння была слаба прыстасавана да баявых дзеянняў. У выніку Чырвоная армія не паспела сканцэнтравацца і разгарнуцца на Заходнім фронце. І ў момант нямецкага нападзення была не падрыхтавана да рашучых баявых дзеянняў. [7, с.16].

У цяжкім становішчы аказаліся войскі Заходняй асобай ваеннай акругі, якія размешчаліся на тэрыторыі ад Смаленска да Беластока і мелі задачу прыкрыць 470 км. заходняй граніцы краіны. У іх складзе налічвалася 44 дывізіі. Аднак па асабовым складзе, баявой тэхніцы, сродкам транспарту быў значны некамплект [5с.214]. Праўда ў пачатку верасня 1939 г., улічваючы міжнародную напружанасць, на тэрыторыі

акругі было прызвана з запасу больш за 380 тыс. чалавек. Але ўжо ў канцы месяца пачалося скарачэнне колькасці чырвонармейцаў. Да снежня 1939 г. з войскаў Заходняй асобай ваеннай акругі было зволена ў запас 280 тыс. чалавек [7, с.5-6].

Нават тады, калі кіраўніцтва Беларусі, занепакоенае сітуацыяй на граніцы, 14 мая 1941 г. абмеркавала даклад камандуючага войскамі акругі генерала арміі Д.Р.Паўлава і паведаміла аб стане на граніцы Сталіну, ён заявіў, што гэта спроба справакаваць вайну, якой не трэба паддавацца [5, с.219].

Нельга не ўлічваць і тое, што за два перадваенныя гады значна вырас тавараразварот паміж СССР і Германіяй. Прычым з Германіі павялічыліся пастаўкі зброі і ваеннай тэхнікі. Германія прадавала СССР зенітныя ўстаноўкі, баявыя самалёты, авіяматоры, палявыя гаўбіцы, аптычныя прыцэлы і інш. Савецкія інжынеры вывучалі ваенную тэхніку на германскіх заводах [1,с.182]. Пры гэтым фашысцкае камандаванне разлічвала на маланкавую вайну, і было ўпэўнена, што Чырвоная Армія не зможа выкарыстаць ні сваёй, ні нямецкай новай зброі. Да таго ж, з псіхалагічнага пункту гледжання, ніхто не стане ўзбройваць патэнцыяльнага праціўніка.

Менавіта на гэтым і грунтаваўся асаблівы давер Сталіна да Германіі і яго стаўленне да данясенняў савецкай разведкі. Своеасаблівай устаноўкай для ўсіх службаў, арміі і флоту стала заява ТАСС ад 14 чэрвеня 1941 г., якая адыграла фатальную ролю на пачатку вайны. У ёй сцвярджалася, што Германія выконвае ўмовы савецка-германскага пакта пра ненападзенне.

На самой справе ўсё сталася не так. 22 чэрвеня 1941 г. Гітлер пачаў вайну супраць СССР. Пры гэтым Беларусь адна з першых прыняла магутны ўдар, накіраваны гітлераўскай Германіяй на СССР. Мэтай гэтага нападу з'яўлялася знішчэнне савецкага дзяржаўнага і грамадскага ладу, пераўтварэнне СССР у калонію, заняволенне, анямечванне і фізічнае вынішчэнне савецкіх людзей.

На Мінск, Смаленск і Маскву наступала найбольш магутная група армій «Цэнтр» (камандуючы генерал-фельдмаршал Ф. Бок). Ёй супрацьстаяў Заходні фронт (камандуючы генерал арміі Д.Р.Паўлаў), утвораны на базе Заходняй асобай ваеннай акругі.

Войскі Заходняга фронту налічвалі 672 тыс чалавек, мелі на ўзбраенні, больш за 10 тыс гармат і мінамётаў, 2,2 тыс. танкаў, каля 2 тыс самалётаў. Аднак акруга не была падрыхтавана да адпору агрэсіі. Вышэйшае кіраўніцтва краіны памылкова лічыла, што ў выпадку вайны з СССР фашысцкая Германія ў першую чаргу будзе наступаць на Украіну і Каўказ. Таму большая ўвага звярталася на ўмацаванне паўднёвага, а не заходняга напрамку. [2, с. 59].

У першы дзень вайны савецкім воінам было загадана разбіць групоўкі праціўніка, якія ўкліналіся на тэрыторыю краіны, і з баямі ўварвацца на сумежныя тэрыторыі. Ставячы такую задачу, Стаўка Вярхоўнага Галоўнакамандавання не ведала рэальнае становішча. Ужо 22 чэрвеня вораг глыбока ўклініўся на дзесяткі кіламетраў у раёне Беластока, нягледзячы на жорсткія баі 3-й, 4-й і 10-й армій. [2,с. 60].

Адступаючы пад націскам гітлераўцаў, савецкія салдаты тут мужна змагаліся з ворагам. Гэта адбывалася на пагранічных заставах, на дарогах і пераправах- усюды, дзе ішлі баі. Каля 8 гадзін супрацьстаяла ворагу 3-я застава 86-га Аўгустоўскага пагранічнага атрада Беларускай погранакругі. 32 яе абаронцы пад камандаваннем лейтэнанта У.Усава змагаліся з ворагам да таго часу, пакуль сярод жывых засталіся толькі некалькі чалавек. І гэта пры тым, што на захоп савецкіх пагранічных застаў нямецкае камандаванне адводзіла ўсяго поўгадзіны.

На шашы каля вёскі Сакольнічы Крычаўскага раена на досвітку 17 ліпеня 1941 г. уступіў у адзінаборства з калонай фашыстцкіх танкаў і ў двухгадзінным баі адбіў усе атакі ворага старшы сержант, артылерыст М. Сіроцкі, аддаўшы свае жыццё за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы. Савецкія войскі адступалі, і камандзір гарматы Сіроцкі дабраахвотна вызваўся прыкрыць адыход сваей часці. Ен размясціўся ў жыце і калі паказаліся нямецкія танкі, падбіў першую і апошнюю машыны. У выніку ўтварылася пробка. Сіроцкі мог адыйсці, але адзін больш дзвюх гадзін утрымліваў абарону, знішчыў 10 танкаў і больш 50 гітлераўцаў. Немцы былі

ўпэўнены, што змагаюцца з гарматнай батарэяй і здзівіліся мужнасці савецкага салдата, які адзін вёў бой і знішчыў такую колькасць іх танкаў і вайскоўцаў [5, с.262-263].

Савецкія салдаты ішлі ў няроўнае змаганне з ворагам, аказваючы яму ўпартае супраціўленне. Больш чым на тыдзень затрымалі наступленне 25 нямецкіх дывізій 11 дывізій Чырвонай Арміі, якія апынуліся ў акружэнні пад Навагрудкам. Геранічна змагаўся гарнізон Брэсцкай крэпасці. «Умираю, но не сдаюсь», - гэтыя словы, напісаныя штыком на сцяне крэпасці, гавораць пра многае. Папаўшыя ў акружэнне салдаты трымалі тут абарону амаль месяц. Гэта не дазволіла гітлераўцам развіць наступленне на смаленскім напрамку, а савецкае камандаванне мела магчымасць лепш падрыхтавацца да абароны на Дняпры. Нездарма Гітлер і Мусаліні наведалі зруйнаваную крэпасць у жніўні 1941: ім было не зразумела, што дазволіла яе гарнізону так доўга трымацца. Вядома, што маёр П. Гаўрылаў, які афіцыйна лічыцца апошнім абаронцам крэпасці, даў бой на 32 – гі дзень вайны і кантужаным апынуўся ў палоне.

Магілёўская абарона, якая працягвалася больш за 3 тыдні, стала прыкладам арганізаванага адпору ворагу. Грамадзяне капалі акопы, траншэі, наладжвалі супрацьтанкавыя загароды. У асобныя дні ў такіх работах удзельнічала да 40 тыс чалавек. Фарміравалася народнае апалчэнне. У выніку геранічнай абароны Магілёва, дзе былі сканцэнтраваны сілы групы армій «Цэнтр», савецкае камандаванне выйграла час для падрыхтоўкі наступных баёў. [2, с. 370].

«Я не был солдатом, был всего только корреспондентом, -- пісаў К.Сіманаў, -- однако у меня есть кусочек земли, которой мне век не забыть, -- поле под Могилёвом, где я впервые в июле 1941 г. видел, как наши солдаты в течение одного дня подбили и сожгли 39 немецких танков…» [10, с.8-9].

Жорсткія баі летам 1941 г. адбыліся пад Бабруйскам, Рагачовам, Жлобінам. У жніўні 1941 г. 20 дзён абараняўся Гомель, дзе вораг страціў больш за 80 тыс. чалавек і значную колькасць баявой тэхнікі. У Віцебску, Гомелі, Магілёве, Пінску, а таксама ў Кастрычніцкім, Ельскім, Лельчыцкім, Рагачоўскім і інш. раёнах ствараліся знішчальныя батальёны, групы самаабароны, якія разам з Чырвонай арміяй абаранялі свае гарады і вёскі. [3, с. 72].

Пасля таго, як немцы захапілі г. Гомель, і салдаты Мазырскага УР яго пакінулі, вайскоўцы 75-й стралковай дывізіі, Жыткавіцкага пагранатраду, матросы Дняпроўскай і Пінскай флатылій, народныя апаўчэнцы і іншыя салдаты –акружэнцы 23 дні, будучы ў адрыве ад фронта працягвалі барацьбу ў Мазырскім УР, перашкаджаючы прасоўванню варожых войск на Маскву. Тут нельга не пагадзіцца з даследчыкам С.Я.Новікавым аб тым, што баі на гомельскім напрамку мелі ўнікальны характар і заставілі немцаў унесці карэкціроўку ў свае першапачатковыя планы [8, с. 96.97].

Такім чынам, салдаты першых месяцаў вайны далі магчымасць нашай краіне для пераўзбраення, стварэння неабходных людскіх і матэрыяльных рэзерваў, якія дазволілі перамагчы гітлераўцаў. І, калі Брэст быў прыкладам мужнасці і гераізма ў барацьбе з ворагам на пагранічнай мяжы Беларусі, дык на Дняпры, ва ўмовах акружэння, абаронцы Магілева вытрамалі моцныя атакі гітлераўцаў, і зноў затрымалі іх на беларускай зямлі.

Сутыкнуўшыся з моцным супраціўленнем на беларускай зямлі гітлераўцы не дасягнулі пастаўленай імі мэты ў летняй кампаніі 1941 г. Аднак спыніць ворага савецкім войскам не ўдалося. Заходняя частка Беларусі была захоплена на працягу некалькіх дзён, на 6-ы дзень вайны быў захоплены Мінск. У акружэнні апынуліся войскі Чырвонай арміі, што знаходзіліся на захадзе ад горада, агульнай колькасцю больш за 300 тыс. чалавек. Да пачатку верасня ўся тэрыторыя Беларусі была акупіравана.

Ва ўмовах акупацыі перад людзьмі паўстала пытанне, што рабіць, як вырашыць свой лес, як уладкаваць сваё жыццё, што стане з Бацькаўшчынай. І многія ўзняліся на барацьбу, усталі на абарону свайго лёсу, сваёй зямлі. Шырокае развіццё ў Беларусі атрымаў партызанскі рух.

Адны партызанскія атрады ствараліся партыйнымі камітэтамі на месцах, другія засылаліся з-за лініі фронту. Фарміравалі партызанскія атрады і ваеннаслужачыя, якія трапілі ў акружэнне. Развіццю партызанскага руху ў Беларусі спрыялі беззаконне і свавольства акупантаў. Сярод актыўных удзельнікаў барацьбы былі і тыя, хто не ўваходзіў у склад партызанскіх атрадаў. Жыхары вёсак забяспечвалі партызан харчаваннем, адзеннем, вялі разведку, дапамагалі выводзіць са строю шашэйныя і чыгуначныя камунікацыі, парушаць лініі сувязі.

Працэс стварэння партызанскіх атрадаў і падпольных арганізацый на акупіраванай тэрыторыі Беларусі быў цяжкім. Не адразу гэта работа атрымала належны размах і высокую эфектыўнасць. Справа ў тым, што савецкія людзі аказаліся не падрыхтаванымі да вайны, да барацьбы ў тыле ворага на сваёй тэрыторыі. Для гэтага патрэбна была спецыяльная ваенна-тэхнічная падрыхтоўка. Да таго ж насельніцтва і маральна не было падрыхтавана да магчымасці паражэння. Усе гэта ў пачатку вайны адмоўна ўздзейнічала на людзей.

Найбольш складаным быў 1941 г. Адступленне Чырвонай арміі з тэрыторыі Беларусі, адсутнасць сувязі з цэнтральнымі кіруючымі органамі, псіхалагічная непадрыхтаванасць людзей, якія пэўны час разлічвалі на хуткую перамогу ў вайне, недахоп зброі і боепрыпасаў, медыкаментаў, складаныя зімовыя ўмовы адмоўна адбіліся на развіцці партызанскага руху. Частка партызанскіх атрадаў і груп была разгромлена, некаторыя самараспусціліся ці перайшлі ў савецкі тыл.

Праўда, і ў гэтых складаных умовах на тэрыторыі рэспублікі барацьбу з ворагам працягвалі каля 200 атрадаў і груп. Яны падрывалі варожыя эшалоны, знішчалі германскіх вайскоўцаў і іх памагатых, грамілі нямецкія гарнізоны, чыгуначныя і шашэйныя масты, палілі склады з гаручым і боепрыпасамі. Толькі са жніўня 1941 па чэрвень 1942 г., паводле даных гітлераўскай адміністрацыі, на тэрыторыі генеральнай акругі «Беларусь» партызаны здзейснілі 176 нападаў на гарнізоны, апорныя і іншыя пункты акупантаў.

З пачаткам вайны не ўсюды і не ўсе мясцовыя жыхары аднолькава прыхільна ставіліся да партызанскага руху. У сувязі з адступленнем Чырвонай арміі, якое праходзіла не арганізавана, і наступленнем гітлераўцаў, у людзей была некаторая разгубленнасць, страх. Частка несельніцтва Беларусі была збянтэжана, насцярожана. У некаторых былі і адмоўныя адносіны да партызан.

І ўсе ж у асноўнай большасці насельніцтва, сяляне былі за Савецкую ўладу. Да таго ж, палітыка, якая праводзілася акупантамі, жорсткі рэжым, усталяваны на захопленай тэрыторыі Беларусі, садзейнічалі пашырэнню супраціўлення захопнікам. Нельга не адзначыць і адпаведнага ўплыву на насельніцтва работы з боку патрыетаў, якія тлумачылі мэты гітлераўцаў у вайне; задачы партызанскага руху ў барацьбе супраць захопнікаў. Пры гэтым усе больш рабілася акцэнтаў на нацыянальна-патрыятычных напрамках барацьбы з ворагам. У выніку ў большасці людзей на акупіраванай тэрыторыі змяняўся настрой, узнікала жаданне змагацца за вызваленне сваёй зямлі ад захопнікаў.

Змена настрою насельніцтва ад чакання і разгубленнасці да ненавясці і жадання выгнаць ворага выяўлялася ў росце колькасці партызанскіх атрадаў, не выкананні сельскагаспадарчых паставак, зрыву мабілізацыі мясцовых жыхароў на работу ў Германію, у іншых актах пратэсту. Дапамога партызанам з боку насельніцтва аказвала і вялікі маральна-палітычны ўплыў. Узмацняючы бояздольнасць, яна падымала настрой партызан, аслабляла сілу ворага, яго маральны дух. А насельніцтва ўсе актыўней уключалася ў барацьбу.

Да 25 ліпеня 1941 г. у Беларусі было сфарміравана больш за 100 атрадаў і груп, якія налічвалі звыш 2,5 тысяч чалавек, 88 з іх былі накіраваны з за лініі фронту на захопленую ворагам тэрыторыю. Адным з першых быў Суражскі атрад у Віцебскай вобласці пад кіраўніцтвам дырэктара кардоннай фабрыкі ў рабочым пасёлку Пудаць М.Ф.Шмырова. Толькі ў жніўні – верасні гэты атрад разграміў шэраг варожых гарнізонаў, падарваў некалькі чыгуначных і шашэйных мастоў. На Палессі значныя ўдары па ворагу наносіў партызанскі атрад «Чырвоны Кастрычнік», які ўзначальваў

Ц.П. Бумажкоў, а потым Ф.І. Паўлоўскі. Ім першым з партызан у жніўні 1941 г. было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Важную ролю ў барацьбе з акупантамі адыгрывала дзейнасць падпольшчыкаў. Падполле – гэта масавыя арганізацыі і групы, якія ствараліся і дзейнічалі ў акупіраваных ворагам гарадах і іншых населеных пунктах. Яно вяло баявую, дыверсійную, разведвальную і іншую дзейнасць, якая наносіла ваенную, эканамічную, маральную і палітычнцю шкоду ворагу.

У першы год свайго існавання падполле стваралася ў асноўным па ініцыятыве "знізу". Не маючы вопыту, падрыхтаваных кадраў, яно несла значныя страты. У прынятай дырэктыве СНК СССР і ЦК ВКП (б) ад 29 чэрвеня 1941 г. меліся указанні аб неабходнасці падпольнай барацьбы на захопленай тэрыторыі. Аднак гэта былі агульныя ўказанні. Патрэбна ж было даць канкрэтную праграму работы ў падполлі.

ЦК КП (б) Б, пад кіраўніцтвам якога вялася гэта работа, у пачатку ліпеня 1941 г. разгледзеў канкрэтныя пытанні арганізацыі падполля ў Віцебскай і Гомельскай абласцях. Для кіраўніцтва падполлем ствараліся падпольныя тройкі. У іх уваходзілі партыйныя і савецкія работнікі, актывісты, работнікі органаў унутраных спраў. У тыл ворага было накіравана многа арганізатараў і кіраўнікоў падполля. Аднак не ўсе яны добра ведалі правілы канспірацыі, спецыфіку дзейнасці ў тыле ворага. Акупанты ж у барацьбе з падпольшчыкамі выкарыстоўвалі самыя сур'езныя метады, ад правакацый, подкупу, да масавага знішчэння людзей.

Тым не менш па ініцыятыве многіх патрыётаў, якія аказаліся ў акупацыі, ужо ў ліпені 1941 г. ствараюцца і ўключаюцца ў барацьбу падпольныя групы. У шэрагу выпадкаў спачатку яны дзейнічалі самастойна па сваёй ініцыятыве. Паступова іх работу пачынаюць каардынаваць партыйныя і камсамольскія цэнтры.

Вайна абудзіла рэлігійнае жыцце ў Беларусі. Цяжкія выпрабаванні вайны, нягоды сталі адной з прычын росту рэлігійнасці людзей. Прадстаўнікі розных слаеў насельніцтва шукалі і знаходзілі ў царкве маральную апору і падтрымку.

У такіх абставінах акупанты імкнуліся з прапагандысцкімі мэтамі паказаць сябе абаронцамі рэлігіі. У кастрычніку 1941 г. Генеральны камісарыят Беларусі накіраваў святарам ліст, у якім было пазначана, што праваслаўная царква ў Беларусі павінна называцца «Беларуская праваслаўная аўтакефальная нацыянальная царква». Прызначэнне епіскапаў і святароў павінна было ажыццяўляцца з ведама нямецкіх улад. Прапанавалася распрацаваць і прадставіць акупацыйным уладам статут Беларускай аўтакефальнай царквы. Аднак, значная колькасць святароў Беларусі лічыла, што аддзяленне ад Рускай праваслаўнай царквы можа адбыцца толькі пасля таго, як Беларуская царква будзе падрыхтавана для аўтакефаліі і аформіць гэта аддзяленне афіцыйна з дазволу Маскоўскай Патрыархіі. У час вайны яны кіраваліся заклікамі да барацьбы з ворагам, якія зыходзілі з Паслання кіраўніка Рускай праваслаўнай царквы мітрапаліта Сергія.

Многія маліліся за перамогу ў вайне з гітлераўцамі, падтрымлівалі партызан, збіралі для іх прадукты харчавання і медыкаменты, звесткі пра планы акупантаў. Некаторыя свяшчэннаслужыцелі ўдзельнічалі ў партызанскім руху. У час вайны немцы ажыццяўлялі рэпрэсіі супраць святароў, якія не падпарадкоўваліся ім. Толькі ў Брэсцкай вобласці гітлераўцы спалілі больш 20 храмаў, рэпрэсавалі многіх святароў.[5, с.233].

Пад жорсткі кантроль акупантаў была пастўлена дзейнасць усіх канфесій на тэрыторыі Беларусі. Калі прадстаўнікі каталіцкага духавенства з мэтай аднаўлення ва ўсходніх раёнах Беларусі рэлігійнага жыцця накіравалі туды некалькі дзесяткаў ксянзоў, нямецкія спецслужбы забаранілі гэту місію. Не мелі поспеху і спробы прыхільнікаў беларускага нацыянальнага адраджэння, якія супрацоўнічалі з акупантамі, ажыццявіць беларусізацыю каталіцкай царквы, ліквідаваць у ей польскі ўплыў за лік ксянзоў-беларусаў. Гітлераўцы не жадалі ўмацавання ролі Ватыкана ў Беларусі. Да таго ж яны разглядалі каталіцкі касцёл як спробу польскага ўплыву на беларускія справы. Не лічыліся акупанты з вернікамі і другіх рэлігій, што існавалі на тэрыторыі Беларусі.

Усё гэта сведчыць аб тым, што з самага пачатку вайны Беларусь стала шчытом, які прыкрыў краіну Саветаў. На Беларускай зямлі яе народ разам з прадстаўнікамі іншых нацыянальнасцей народаў СССР актыўна ўступіў у барацьбу з ворагам. Шкада, што зямля не можа гаварыць, а яна б рассказала пра многае…

**Бібліяграфічныя спасылкі:**


1. Беларусь на мяжы тысячагоддзяў. / Рэд. кал. А.П. Вайтовіч і інш. Мінск, "Беларуская энцыклапедыя", 2000.
2. Великая Отечественная война 1941-1945. Энциклопедия. Отв. ред. А.О. Чубарьян – М.: «ОЛМА Медиа Групп», 2010.
3. Всенародная борьба в Беларуси против немецко-фашистских захватчиков. Том 1. Минск, Беларусь 1983.
4. Гребень Е.А. Гражданское население Беларуси в условиях немецкой оккупации (1941 - 1944гг.). Минск: БГАТУ, 2016.
5. Гісторыя Беларусі. (1917 -1945). / П.І.Зялінскі і інш. Мінск, БДУ, 2012.
6. Котляров И. Защитников памяти и правды стало больше. // Беларусь сегодня. СБ, 2015, 7 апреля. С.10.
7. Накануне. Западный особый военный округ. (Конец 1939 г. – 1941 г.). Документы и материалы./ Сост. В.И. Адамушко и др. Минск: НАРБ., 2007.
8. Новікаў С.Я. Беларусь улетку 1941 г. Смаленск:"Універсум", 2015.


УДК 93

## КУЛЬТУРНО-ПРОСВЕТИТЕЛЬСКАЯ ДЕЯТЕЛЬНОСТЬ КНЯЗЯ П.Д. СВЯТОПОЛК-МИРСКОГО НА ПОСТУ ВИЛЕНСКОГО ГЕНЕРАЛ-ГУБЕРНАТОРА


**М.Н. Крот [1,2)]**

*[1)] Южный научный центр Российской академии наук (ЮНЦ РАН)*
*(Российская Федерация, 344006, г. Ростов-на-Дону, пр. Чехова, 41)*
*2) Институт истории и международных отношений Южного федерального университета (ИИМО ЮФУ) (Российская Федерация, 344006, г. Ростов-на-Дону, ул. Б. Садовая, 105/42).*



Национальный вопрос был одной из наиболее сложных проблем, с которыми столкнулась Российская империя в начале XX века. Деятельность князя П.Д. Святополк-Мирского на посту Виленского генерал-губернатора в период с 1902 по 1904 гг. представляла собой попытку выстраивания новой модели управления национальными окраинами, сохранение контроля над которыми в условиях активного формирования региональных идентичностей становится залогом сохранения целостности империи. В статье анализируется культурно-просветительский аспект его деятельности, включавший организацию работы научно-просветительских обществ, проведение региональных исследовательских экспедиций, усилия по открытию учебных учреждений, отмену ряда ограничений в области печати и книгоиздательства. Данные сюжеты рассматриваются в контексте трансформации национальной политики имперских властей, стоявших перед необходимостью диалога с местной общественностью и отказа от жесткой русификаторской политики.



***Ключевые слова:*** Российская империя; П.Д. Святополк-Мирский; Виленское генерал-губернаторство; Северо-Западный край; национальные окраины; русификация.


## CULTURAL AND EDUCATIONAL ACTIVITIES OF PRINCE P.D. SVYATOPOLK-MIRSKY ON THE POST OF VILENSKY GOVERNOR-GENERAL


**M.N. Krot[1,2)]**

*1) Southern Scientific Center of the Russian Academy of Sciences*
*(Russian Federation, 344006, Rostov-on-Don, 41 Chekhov ave.)*
*2) Institute of History and International Relations of the Southern Federal University*
*(Russian Federation, 344006, Rostov-on-Don -Donu, B.Sadovaya str., 105/42)*



The national question was one of the most difficult problems faced by the Russian Empire at the beginning of the 20th century. The activities of Prince P.D. Svyatopolk-Mirsky on the post of Governor-General of Vilna from 1902 to 1904. It was an attempt to build a new model of managing the national suburbs, the preservation of control over which in the conditions of the active formation